Змітрок
Марозаў

# Храм

Вершы
Санеты
Вянкі санетаў

МІНСК
ВЫДАВЕЦТВА «ЧАТЫРЫ ЧВЭРЦІ»
2017

УДК 821.161.1(476)-1
ББК 84(4Беи)-5
М25

**Марозаў, З.**
М25 Храм : вершы, санеты, вянкі санетаў / Змітрок Марозаў. – Мінск : Чатыры чвэрці, 2017. – 178 с.
ISBN 978-985-581-137-5.

Новая кніга паэзіі Змітрака Марозава «Храм» – вершы, санеты, вянкі санетаў, створаныя за многія гады літаратурнай працы.

Аўтар імкнецца асэнсаваць гераічнае мінулае і сённяшні дзень сваёй малой радзімы – «вясковай планеты», працавітых і шчырых людзей, таксама сваё месца ў складаным і супярэчлівым жыцці. Непадробным пачуццём самаахвярнай любові да Радзімы, маці, каханай жанчыны асветлены творы паэта. Яго творчасць ужо даўно прыцягвае ўвагу прыхільнікаў паэзіі. Упэўнены, што і гэты зборнік знойдзе сваіх чытачоў.

**УДК 821.161.1(476)-1**
**ББК 84(4Беи)-5**

ISBN 978-985-581-137-5

© Марозаў З.
(Марозаў Д. Д.), 2017
© Афармленне.
ТДА «Выдавецтва
“Чатыры чвэрці”», 2017

# «Я з вёскі, я – свойскі, Язбоўскі…»

Кожны творца пачынае з першапутку. Для мяне шлях у літаратуру пачаўся з замалёвак і нарысаў. Пасля сканчэння агранамічнага факультэта Беларускай дзяржаўнай сельскагаспадарчай акадэміі паехаў працаваць на Быхаўшчыну. Тады і ўзнікла жаданне дасылаць артыкулы і замалёўкі ў раённую газету. Хацелася, каб пра маіх працавітых вяскоўцаў ведалі не толькі ў калгасе, але і ў раёне.

Там жа пачаў і вершы пісаць. Але адразу ж з гэтым узніклі пэўныя цяжкасці. Калі першапачаткова спробы майго пяра трапілі да вядомага паэта Аляксея Пысіна, то ён іх ахарактарызаваў так: «Цьмяна, абмежавана… Працуй!» З усяго вялікага стосу вершаваных твораў пакінуў толькі тры, якія і былі надрукаваны ў «Магілёўскай праўдзе».

Былі цяжкасці і з выданнем першага зборніка, працу над якім пачаў у 1979 годзе. На рукапіс у выдавецтве рыхтавалася «разгромная» рэцэнзія. Мяне аб гэтым папярэдзіў сам Аляксей Васільевіч і параіў, каб я паспяшаўся ў Мінск «ратаваць» кнігу. Але ў нас з жонкай тады нарадзілася дачка Алеся, і мне было не да зборніка. Праз нейкі час я дапрацаваў рукапіс, станоўчую рэцэнзію на які зрабіў Пятро Прыходзька.

У выніку мая кніга «Пад небам буслiным» пабачыла свет у 1982 годзе.

У 1983 годзе маскоўскім выдавецтвам «Молодая гвардия» быў выдадзены другі паэтычны зборнік «Огонь и жито», рукапіс якога быў разгледжаны і прапанаваны выдавецтву па выніках работы XI Усесаюзнага фестывалю маладых паэтаў у Туве.

Сёння на маім творчым рахунку больш за тры дзясяткі паэтычных зборнікаў, кніжак для дзяцей, а таксама кніга публіцыстыкі «І скажуць унукі». Шэраг твораў уключаны ў школьныя праграмы і падручнікі. Пішу пра перажытае, пра тое, што хвалюе, трывожыць, радуе і баліць.

Маю творчасць сілкуе родная Крупшчына: яе жывічныя бары, прапахлыя навальнічным азонам, густым гаючым водарам хвоі і ядлоўцу, папараці, імхоў і грыбніц, налітых спеласцю сонца суніц, чарніц і журавін, яе чысцюткія крыніцы і буслiныя лугі, найпрыгажэйшае ў свеце возера Сялява, мая радзінная вёска-калыска Язбы, дарагія сэрцу родзічы і землякі.

Язбы. Гэта вёска – малая радзіма, і яна застаецца ў душы, як кажуць, ад нараджэння і да апошніх дзён. Тым больш што менавіта тут прайшло маё дзяцінства, яно непаўторнае. І што, мабыць, у многім загартавала характар – гэта вясковая праца, нялёгкая праца. Таму

ў свой час, калі былі цяжкія моманты ў жыцці, такая загартоўка дапамагала мне пераадольваць цяжкасці і крочыць далей.

Нас у маці з бацькам было трое сыноў. Тады ж менш за трох дзяцей у хаце звычайна не мелі. У пасёлку Язбы з 28 хатак хлопцаў набіралася на дзве моцныя футбольныя каманды. І калі да нас мінчукі прыязджалі на летнія канікулы, то мы іх у футбол раскатвалі «пад качан». У нашай зборнай я гуляў у якасці нападаючага на правым флангу.

Затое ў жыцці нападаючым ніколі не быў, хоць і займаў значныя пасады. Гэта не мой стыль.

*Мне вечна злосці не хапала,*
*Таму «зычліўцы» ўсіх масцей*
*Мяне дзяўблі.*
*Ды, пэўна, мала,*
*Як і раней, люблю людзей.*
*Боль аддаю нямой паперы,*
*За дабрату дабром плачу…*
*Чым б'юць мацней, тым болей веры,*
*Што не дарэмна свет капчу.*

Магчыма, мае рацыю паэт, сцвярджаючы, што «добро должно быть с кулаками». Але я цвёрда ўпэўнены ў адным: якую пасаду ні займаеш, заўсёды трэба быць адказным за свае паводзіны. І чым вышэй пасады, тым вышэй адказнасць.

Ніколі не зайздрошчу людзям, якія дасягаюць поспеху. Асабліва, калі чалавек наблізіўся да нейкай жыццёвай вышыні сваім мазалём, працай сваёй душы. Калі гэта зроблена самастойна, я вельмі паважаю такіх людзей.

Для мяне быць лідарам – гэта перамагчы асабіста сябе. Адолець ляноту, часам недысцыплінаванасць. Мой галоўны сапернік – я сам. Увесь час імкнуся над сабой працаваць. Калі спыняецца праца над сабой, спыняецца і творчы працэс.

Колькі буду пісаць вершы, столькі буду і вучыцца. Вучыцца ў тых людзей, якія дапамаглі мне знайсці, адчуць і загартаваць свой голас. Гэта Мікола Падабед, Мікола Леўчанка, Аляксей Пысін, Янка Сіпакоў, Васіль Зуёнак, Васіль Макарэвіч, Мікола Аўрамчык, Яўгенія Янішчыц, Мікола Федзюковіч, Яўген Крупенька, Анатоль Вялюгін, Раіса Баравікова, Юрась Свірка, Валянцін Лукша, Леанід Дайнека, Хведар Жычка, Алесь Карлюкевіч, Вячаслаў Рагойша…

А галоўным крэда ў маёй творчасці служаць словы малавядомага ў нас паэта-хірурга з Магілёва (на жаль, ужо нябожчыка) Аляксандра Мельнікава: «Поэзия – души работа при свете совести живой…»

*Вёсцы-калысцы Язбы,*
*роднай Крупшчыне,*
*дарагім землякам*
*прысвячаю*

# ВЕРШЫ

# АНКЕТА ПАХОДЖАННЯ

Я з вёскі,
Я – свойскі,
Язбоўскі,
Сялянскі,
Славянскі,
Зямны,
Ад плуга,
Ад луга,
Дзе туга
Даваўся мне ўкос.
Я – з вайны.
Маланкамі мечаны,
Вечнасць
Узняў я на плечы свае…
Я з вёскі,
Я – свойскі,
Язбоўскі…
Адсюль і трывогі мае.

* * *

Нашу ў сабе я свет і антысвет,
Дабро і зло, крык слова і зняменне,
Мой прашчур у пятнаццатым калене
Маёй крывёй выслухвае Сусвет.
Там, сярод зор, напэўна, ёсць мая,
Адзіная адвеку зорка долі,
Яна маё сілкуе біяполе,
І не сабе, а ёй належу я.
Таму і не гадаю на жыццё,
Я смерць усёй істотай не прымаю,
Бо продкаў дух штодзённа адчуваю
Цераз траву, карэнне і лісцё.

* * *

Мне Богам дадзена Радзіма.
І адабраць яе ў мяне
Пад страхам смерці немагчыма
Тым, хто жыруе на мане.
Мне Богам дадзена Радзіма.
І я заручаны душой
З яе азёрнымі вачыма,
З яе жытнёвай цішынёй.
Мне Богам дадзена Радзіма…
Зноў, як замову, паўтару:
«Мне без яе жыць немагчыма,
Без Беларусі я памру».

* * *

Спыніся, вечнасці імгненне,
Закрэслі тое, чым я жыў…
Я прадчуваю абнаўленне
Зямной прыроды і душы.

Былых пачуццяў попел – вершы –
Я ўжо даўно не варушу,
Не для таго, каб люд пацешыць,
Суд над самім сабой вяршу.

Хачу пачаць свой шлях нанова,
Свет зорны зведаць прагну я,
Як немаўля ў чаканні слова,
Душа пакутуе мая.

* * *

Няўжо магу я здрадзіць,
Змяняць на іншы край
Салоўку ў родным садзе,
За вёскай ціхі гай?

Няўжо мне хопіць сілы,
Адрынуць назаўжды
Палеткаў гоман мілы,
Крынічны звон вады?

Няўжо магу забыцца
На родныя крыжы,
Дзе трэба спаталіцца
Зняверанай душы?

Няўжо спяваць магчыма
Сярод чужых краёў
Без маці, без Радзімы,
Без родных салаўёў?

* * *

*В. Ф. Касцючэнку*

Сэрца вёскі маёй –
Студня з чыстай вадой,
Ты дазволь мне з дарогі
Табе пакланіцца,
Каб з крыніцы жывой
Жураўлінай рукой
Зачарпнуць мёд зямны
І са смакам напіцца.
Мне спасцігнуць дазволь
Твой нязведаны боль,
Ты дазволь мне трывогай
Тваёй прычасціцца.
Сэрца вёскі маёй –
Студня з чыстай вадой,
Хай ніколі твая
Не знямее крыніца.

# Пра аўтара

**Змітрок Марозаў** нарадзіўся 30 верасня 1953 года ў пасёлку Язбы Крупскага раёна Мінскай вобласці.

Пасля заканчэння Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі працаваў аграномам на Магілёўшчыне, у Міністэрстве сельскай гаспадаркі і харчавання Рэспублікі Беларусь, апошнім часам — у Міністэрстве гандлю.

Выдаў 30 кніг паэзіі і прозы. Сярод іх — першы ў еўрапейскай літаратуры вянок вянкоў санетаў «Апакаліпсіс душы» (1991).

Многія творы, а таксама зборнік вершаў паэта «Вяртанне да цішыні» ўключаны ў школьныя праграмы, падручнікі, дапаможнікі для навучэнцаў і студэнтаў сярэдніх спецыяльных і вышэйшых навучальных устаноў.

Шэраг кніг Змітрака Марозава адзначаны рэспубліканскімі прэміямі ў галіне літаратуры. Паэт з'яўляецца лаўрэатам Міжнароднага літаратурнага конкурсу «Сям'я — Яднанне — Айчына» (2014).

# Змест

«Я з вёскі, я – свойскі, Язбоўскі...» . . . . . . 3

## ВЕРШЫ

Анкета паходжання . . . . . . . . . . . . . . . . . . 8
«Нашу ў сабе я свет і антысвет...» . . . . . . . . 8
«Мне Богам дадзена Радзіма...» . . . . . . . . . 9
«Спыніся, вечнасці імгненне...» . . . . . . . . . 9
«Няўжо магу я здрадзіць...» . . . . . . . . . . . 10
«Сэрца вёскі маёй...» . . . . . . . . . . . . . . . 10
«Прыходзьце, людзі, ў госці да мяне...» . 11
Апанас . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 11
Салавецкая балада . . . . . . . . . . . . . . . . . 12
«Хрыста распялі на крыжы...» . . . . . . . . . 12
Беларусы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 13
Братам Алесю і Рыгору . . . . . . . . . . . . . . 13
Камяні . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 14
Стары халасцяк . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 14
Чытаючы вечную кнігу . . . . . . . . . . . . . . 15
«Над чым паэт гарыць-згасае?..» . . . . . . 15
«Хаты. Жытняя палоска...» . . . . . . . . . . . 16
«Вечар. Ціхая дарога...» . . . . . . . . . . . . . 16
«Спяшаюся я жыць. Кудысьці еду...» . . . 17
Вясковыя гармонікі . . . . . . . . . . . . . . . . 17
«Над ракой – пагост...» . . . . . . . . . . . . . . 18
«Аляксандры, Марылі, Домны...» . . . . . . 18
Час... . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 19
«Ты са мной – і сонейка смяецца...» . . . . 19
Плач перапёлкі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 20
«Шлях дарогі не знае...» . . . . . . . . . . . . . 20
Ванечка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 21
«Я не кляну сваё былое...» . . . . . . . . . . . 21
«Бярозавая светласць...» . . . . . . . . . . . . 21
«Я пераджыў сябе самога...» . . . . . . . . . . 22
Трыялет . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 22
Вандроўнік . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 23

«Лубіну сіняе мора...» . . . . . . . . . . . . . . . . 23
«Не страшна мне,
што сэрца разарвецца...» . . . . . . . . . . . . . 24
«Канае месяц. Спіць сяло...» . . . . . . . . . . . 24
«Адгукніся, далёкі прашчур...» . . . . . . . . . . 25
Сябар дзяцінства . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 25
«Шчаслівы, бо жыву...» . . . . . . . . . . . . . . . 26
«Ноч. Вясна. Шэкспір. Санеты...» . . . . . . 26
«Я раздаваў пачуцці людзям...» . . . . . . . 27
«Напішыце мне ліст з маладосці...» . . . . 27
«Жанчына ў чорным, Вас я знаю...» . . . . 28
«Кінь, сыночак, вершы...» . . . . . . . . . . . . . 28
Язбоўскі Бетховен . . . . . . . . . . . . . . . . . . 29
«Былых сяброў ніколі не забуду...» . . . . . 29
«У наш вірлівы, каламутны час...» . . . . . 29
«Не кожная зорка
можа быць сонцам...» . . . . . . . . . . . . . . . 30
«Недзе ў полі вецер плача...» . . . . . . . . . . 30
«Я блукаў па чарнобыльскім лесе...» . . . 31
«Раскалыхвае восеньскі вецер...» . . . . . . 31
«Мы будзем жыць! Мінуць нягоды...» . . 32
«Жыццё не раз мяне ламала...» . . . . . . . . 32
«Стварай, калі ёсць воля Бога...» . . . . . . 33
Смерць жураўля . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 33
«Таццяна...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 33
«Дабро і зло, вернасць і здрада...» . . . . . 34
«Самыя спеўныя птушкі...» . . . . . . . . . . . 34
«Рукі дадзены чалавеку...» . . . . . . . . . . . 35
«Калі б я змог зразумець...» . . . . . . . . . . 35
Вячэра на Вялікдзень . . . . . . . . . . . . . . . 36
Ачышчэнне . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 37
«Начнога неба каляіна...» . . . . . . . . . . . . 37
«Аднастайныя шэрыя будні,
як шэршні...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 38
«Як хораша вальсуе
матылёк-аднадзёнка...» . . . . . . . . . . . . . 38
«Бог белы свет стварыў. І я таксама...» . . 38
«Сад забыты...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 39

«Сіні-сіні сон асін…» . . . . . . . . . . . . . . . . . 39
Доля . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 40
Гармонія . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 40
«Нарадзіўся на свет і аб тым,
што жыву…» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 40
«У лугах згасаюць краскі…» . . . . . . . . . . . 41
«Лясы не просяць літасці ў людзей…» . . 41
«На вятрах расхрыстанага веку…» . . . . . 41
«Нішто ў прыродзе не знікае…» . . . . . . . 42
Прага цішыні . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 42
«Палёт чмяля і птушкі рэактыўнай…» . . 42
Паклёп . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 43
«Ціхі плёскат хвалі соннай…» . . . . . . . . . 43
«Калі размаўляюць вочы…» . . . . . . . . . . . 44
«Адыходжу Шляхам Млечным…» . . . . . . 44
«Басаногае сэрца спаткаў я ў дарозе…» . 45
«Жанчына слухала санеты…» . . . . . . . . . 45
«У бясконцых пошуках
роднай душы…» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 46
«Мокры грак сумуе на бярозе…» . . . . . . . 46
«Шэры горад. Шэры дзень…» . . . . . . . . . . 47
«Не трэба аплёўваць мінулае…» . . . . . . . 47
«Я шлях пачынаў свой няблізкі…» . . . . . 48
«Прадаюцца за чыны і званні…» . . . . . . 48
Вясковая ідылія . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 49
«Нас душы продкаў зберагаюць…» . . . . . 49
«Шкада мне зорак, што згасаюць…» . . . 50
«Там, дзе аплёўваюць святыні…» . . . . . . 50
«Рэвалюцыі робяць вар'яты…» . . . . . . . . 50
«На зямлі сваёй мы толькі госці…» . . . . 51
«Мне даўно не снілася матуля…» . . . . . . 51
Удовы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 52
«Хутка ранак. А мне ўсё не спіцца…» . . . 52
«Я ад Вас нічога не чакаю…» . . . . . . . . . . 53
«Спявала песню аб вясне…» . . . . . . . . . . 53
Братам . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 53
«Не хачу быць разменнай манетай…» . . 54
«Мядунковае ранне…» . . . . . . . . . . . . . . . 54

Снежны чалавек . . . . . . . . . . . . . . . . . 55
«Няма куды мне больш імкнуцца…» . . . 55
«У пошуку ўяўнай свабоды…» . . . . . . . . . 56
«Тры словы я табе сказаў…» . . . . . . . . . . . 56
Бусел чорны . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 56
«Маленькае хлебнае зернятка…» . . . . . . 57
«Перад світаннем…» . . . . . . . . . . . . . . . . 57
«Сталая жанчына…» . . . . . . . . . . . . . . . . 58
«Завершанасць свету пужае…» . . . . . . . . 58
Марозіха . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 59
«Хутка восень.
Бярозы лістотай пяюць…» . . . . . . . . . . 59
Апошні набат . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 60
«Накасіўшыся ўволю…» . . . . . . . . . . . . . 60
«Той, хто светла кахае…» . . . . . . . . . . . . 60
«Над зайздрасцю,
над хцівай мітуснёй…» . . . . . . . . . . . . . 61
«Люблю рамонкі палявыя…» . . . . . . . . . . 61
Балада пра несмяротнасць . . . . . . . . . . . 62
«Памёр настаўнік мой любімы…» . . . . . . 62
«Марнее родная прырода…» . . . . . . . . . . 63
«Калі б нават чысты душой і сэрцам…» 63
«Памру ўначы ці на дасвецці…» . . . . . . . 64
«Мова гіне! Свет дзічэе!…» . . . . . . . . . . . 64
«Тыран сканаў! Не стала Рыма…» . . . . . . 64
«Я не кахаю Вас, паэт…» . . . . . . . . . . . . . 65
«Калі жанчына разлюбіць…» . . . . . . . . . . 65
Прабач . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 66
Твае далоні . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 66
«Не на карысць мінулых бед урокі…» . . 66
«Мелюць веку жудасныя жорны…» . . . . 67
«Люблю глядзець, калі паволі…» . . . . . . . 67
«Характарам і лёсам вуглаваты…» . . . . . 68
«Праліўся дождж ык на світанні…» . . . . . 68
Сеўка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 69
«Малюся я зямной траве…» . . . . . . . . . . . 69
Пярэварацень . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 70
Акварэлі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 70

«Люблю цябе, матчына мова...» . . . . . . . 72
Чалавек натоўпу . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 72
«Не разумею век...» . . . . . . . . . . . . . . . . . 73
Летні вечар у Язбах . . . . . . . . . . . . . . . . . 73
«Ціхая, жытнёвая, лясная...» . . . . . . . . . . . 74
«Высока ў небе сокал кружыць...» . . . . . . . . 74
«Я ўспамінаю спакваля...» . . . . . . . . . . . . . 75
«Меланхалічныя бярозы...» . . . . . . . . . . . . 76
Слова . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 76
«Зноў прыдумваем законы...» . . . . . . . . . 77
«Пагляджу на неба і прыпомню...» . . . . . 77
«Ноч. Поле. Маладзік...» . . . . . . . . . . . . . 78
«Цень матулі, згорблены, балесны...» . . 78
«Калі шукаюць вінаватых...» . . . . . . . . . . . 79
«Аб чым спрачаюцца гісторыкі...» . . . . . 79
«Бабулька з іконкай...» . . . . . . . . . . . . . . 80
Продкі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 80
Вясновае . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 81
«Не адшукаўшы той душы...» . . . . . . . . . . 81
«Не мітусіся ў пошуках свабоды...» . . . . 81
«Стары і хворы воран...» . . . . . . . . . . . . . 82
«Ад зямлі аж да Млечнага Шляху...» . . . . 82
«Непаўторна, па-летняму звонка...» . . . 83
Дэман . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 83
«Ападае бярозавы ліст...» . . . . . . . . . . . . 84
«Рукі з сяўнёю век сябравалі...» . . . . . . . 84
«Я шмат каго перажыву...» . . . . . . . . . . . . 85
«Калі народ не хоча слухаць...» . . . . . . . . 85
«Абяцаюць хуткі рай народу...» . . . . . . . . 85
«Зацьменне розуму людскога...» . . . . . . . 86
Эвалюцыя . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 86
«Светлая святасць бяроз...» . . . . . . . . . . . 87
«Пасеяна д'яблам распаду насенне...» . . 87
«Люблю палын старых пагостаў...» . . . . . 88
«Цісне час на сэрца гулкім прэсам...» . . 88
«Лістападаўскі сіні бярэзнік...» . . . . . . . . 88
Апошняе каханне . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 89

«Вераснёўскае поле.
Жураўлінае неба...» . . . . . . . . . . . . . . . . 89
«Не называй мяне прыгожай...» . . . . . . . 90
«Белыя зоркі лілей...» . . . . . . . . . . . . . . . 90
«Я Вас кахаў...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 91
«Як много навокал прасторы...» . . . . . . . 91
«Мілая кастрычніцкая проза...» . . . . . . . 91
У прыгараднай электрычцы . . . . . . . . . . 92
Паэт . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 93
Каханай . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 93
«Паэт, які піша добрыя вершы...» . . . . . . 94
Пасля пахавання . . . . . . . . . . . . . . . . . . 94
«Багата тайнаў у прыроды...» . . . . . . . . . 95
Дом . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 95
«Я прыручаны ласкай жаночай...» . . . . . 96
«Дзядулі словы... іх не сцерці...» . . . . . . . 96
«Не хавай ад маці боль штораз...» . . . . . 97
«Дзяўчынка чорны хлеб вагае...» . . . . . . 97
«Поўня на хмарным восеньскім небе...» 97
«Што ж ты, дружа мой верны,
сумуеш...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 98
Тост . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 98
«У вёску на дасвецці...» . . . . . . . . . . . . . 99
Гора . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 99
«Нешта з сэрцам не тое...» . . . . . . . . . . 100
Твары . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 100
«Ужо сахі не стрэцім дапатопнай...» . . 100
«Квецень яблынь ля хаты...» . . . . . . . . . 101
«Мой сталы клён пазалаціўся...» . . . . . . 101
Парада . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 102
«Я такіх жанчын яшчэ не бачыў...» . . . . 102
Стары хутар . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 103
Страта . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 103
Чытаючы Алеся Пісьмянкова . . . . . . . . 103
Маналог развітання . . . . . . . . . . . . . . . . 104
«У кожным немаўляці...» . . . . . . . . . . . . 104
«Жніўны вечар ціха атуляе...» . . . . . . . . 105
«Крычаў наш "класік": "Я – прарок"...» . 105

Начны салавей . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 105
«Жывем у клетках
шыкоўных кватэр…» . . . . . . . . . . . . . . . 106
Таемнасць . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 106
«Загадкі кольцаў гадавых…» . . . . . . . . . . 106
«Пад шатамі ліп векавых…» . . . . . . . . . . . 107
«Ад зор, што на небе гараць…» . . . . . . . 107
«Навошта сляпому святло…» . . . . . . . . . 107
«Жыве толькі дзень матылёк…» . . . . . . 108
«Навошта народу правы…» . . . . . . . . . . 108
«Апошні раз касмічны пыл
Галактык…» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 108
«Ты просіш: “Брат, дапамажы”…» . . . . . 109
Унучцы Машы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 109
Унучцы Маргарыце . . . . . . . . . . . . . . . . 109
Упэўненасць . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 110
«Сярод тлуму і ляманту…» . . . . . . . . . . 110
«Здані белых варон…» . . . . . . . . . . . . . . 110
«Жыву цішэй з узростам…» . . . . . . . . . . 111
«Змяніўся век. Перавярнуўся свет…» . . 111
«Мужчыны рана паміраюць…» . . . . . . . 111
Хварэе маці . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 112
«Помню я, перад смерцю матуля…» . . . 112
Гаданне . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 113
«Не будзіце любых на світанні…» . . . . . 113
«“Кахаю!” – нам шаптала жыта…» . . . . 114
«У штодзённай пагоні…» . . . . . . . . . . . . 114
«На сцяне вісела старая…» . . . . . . . . . . 115
Спадчына . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 115
Бабулін каменьчык . . . . . . . . . . . . . . . . 115
«Адкуль прыйшла ты да мяне?..» . . . . . 116
«Вецер, быццам касцёр…» . . . . . . . . . . . 116
«На скрыжаваннях волі і няволі…» . . . . 116
«Шызы вецер. Мокры снег…» . . . . . . . . 117
Афрадыта . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 117
«Люблю вясновы лес…» . . . . . . . . . . . . . 118
«Маю бабулю за сабаку…» . . . . . . . . . . . 118

«Я хачу быць з табой
цёмнай ноччу і днём…» . . . . . . . . . . . . 119
«Нясу свой крыж да ціхага пагоста…» . 119
Пытанні ісціне . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 120
«Дабразычліўцам» . . . . . . . . . . . . . . . . . 120
«Месяц белы, бы ў свята
настольнік…» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 121
«Адзінокая жанчына…» . . . . . . . . . . . . . 121
Дыялог кахання . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 122
«Гучала музыка ў цішы…» . . . . . . . . . . 122
Храм . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 123
«Жалезабетонны горад…» . . . . . . . . . . . 124
«Гарадскі пагост. Нібы ў тумане…» . . . . 124
У гарадскім скверыку . . . . . . . . . . . . . . 125
Прабачэнне . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 125
«На парозе зімы…» . . . . . . . . . . . . . . . . . 126
Жаданне . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 126
«Пасля маці – нікога…» . . . . . . . . . . . . . 127
«Як жыў? – Пра гэта скажуць людзі…» . 127
«Прыйшоў я ў свет не выпадкова…» . . 127
«У вёсцы баўлю залатыя дні…» . . . . . . 127
«Закончу жыццё шляхам зерня…» . . . . 127
«Слова – боль, якім працята сэрца…» . 128
«Месік заглядзеўся ў студню…» . . . . . . . 128
Матуля . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 128
«Дыктуе хтосьці мне правы…» . . . . . . . 129
«Цямней за ноч душа чужая…» . . . . . . . 129
«“Свет адраджаецца ў крыві”…» . . . . . . 129
Ружа . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 130
Сон пастушка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 130
«Быў малады і лётаў,
быццам сокал…» . . . . . . . . . . . . . . . . . . 131
Для цябе . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 131
«Бывайце, самотныя цені…» . . . . . . . . . 131
«Радзімкі зорка на шчацэ…» . . . . . . . . . 132
Старая вярба . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 132
Гарэза . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 133
Цвыркун . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 133

«Жніўны вечар прылёг на палі...» . . . . . 134
Цень . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 134
«На гняздзе самотны бусел...» . . . . . . . . 134
Душа . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 135
«На схіле дня зямнога веку...» . . . . . . . . 135
«Дзіцячая слязінка...» . . . . . . . . . . . . . . 135
«Нібыта недапісаны раман...» . . . . . . . . . 135
«Жыццё людское: звады, мітусня...» . . 136
«Днём і ноччу, без сну...» . . . . . . . . . . . . 136
«Шануйце кожную хвіліну...» . . . . . . . . . 136
«Сярод жытнёвае раўніны...» . . . . . . . . . 136

## САНЕТЫ, ВЯНКІ САНЕТАЎ

«Маўклівы суразмоўца мой, Максім...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 138
Памяць . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 138
«Як не стае мне сонца для душы!..» . . . 139
«Старэнькі сад наводшыбе сяла...» . . . . 139
«Свабоду па закону не даюць...» . . . . . . 140
Жаўрук . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 140
«Жыццё і смерць пануюць на зямлі...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 141
«Кароль санетаў, велічны Петрарка...» 141
Каханне . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 142
«Святло і цемра. Дабрата і зло...» . . . . . 142
Вянок Беларусі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 143
З вянка вянкоў санетаў . . . . . . . . . . . . . 151
«Не парушай ілюзіяй кахання...» . . . . . 167
Санет маці . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 167

*Пра аўтара* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 168